# Гісторыя

А. У. ПАЗНЯКОЎ

## АДРАДЖЭННЕ І РАЗВІЦЦЁ СІСТЭМЫ ПАРТЫЙНАЙ ВУЧОБЫ Ў БССР У ПЕРЫЯД ПЕРАХОДУ ДА МІРНАГА БУДАЎНІЦТВА (1944—1950)

Пасля вызвалення раёнаў і абласцей рэспублікі ад нямецкіх захопнікаў перад Камуністычнай партыяй Беларусі паўстала задача адраджэння ўсіх бакоў матэрыяльнага і духоўнага жыцця савецкіх людзей, у тым ліку і ідэйнага выхавання. Практычная работа пачалася па меры фарміравання і ўмацавання партыйных арганізацый і партыйных органаў. Не аднесеная да разраду прыярытэтных напрамкаў дзейнасці КП(б) Беларусі партыйная вучоба адраджалася разам з масава-палітычнай работай, на што накіроўвала рашэнне ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б) Беларусі ў галіне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва» (жнівень 1944 года)[1]. Гэта пастанова прадвызначыла і другую асаблівасць першага этапу развіцця партыйнай асветы ў рэспубліцы (1944—1946 гады)—першачарговае аднаўленне сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кіруючых кадраў. Яна ўключала ў сябе партыйныя школы пры райкомах, абкомах і ЦК КП(б)Б, універсітэты марксізму-ленінізму, курсы.

У гэтыя гады рэспубліка адчувала востры недахоп падрыхтаваных кіраўнікоў. Так, на 1 чэрвеня 1945 года рэспубліканскія, абласныя, гарадскія і раённыя партыйныя і камсамольскія органы былі ўкамплектаваны на 81 %[2], прычым адукацыйны ўзровень большасці работнікаў быў вельмі нізкім. Таму, напрыклад, праграма раённых партыйных школ, акрамя гісторыі ВКП(б), уключала ў сябе вывучэнне дзяржаўнага ладу СССР, геаграфіі, гаспадарчых пытанняў. Усяго ў рэспубліцы ў 1946 годзе дзейнічала 10 універсітэтаў марксізму-ленінізму, 204 вячэрнія партыйныя школы, а 30 тыс. камуністаў рэспублікі вывучалі марксісцка-ленінскую тэорыю самастойна [3].

Заняткі ў раённых партыйных школах і іншых вышэйшых формах партыйнай асветы, несумненна, павышалі агульнаадукацыйны і ідэйны ўзровень кіруючых кадраў, аднак не гэты ўзровень часам вызначаў прыгоднасць камуніста да кіруючай работы. Ва ўмовах жорсткай адміністрацыйнай сістэмы ад кіраўнікоў любога ранга патрабавалася ў першую чаргу выканаўчасць і паслухмянасць. У гэтых умовах работа па павышэнню свайго ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню многімі расцэньвалася як лішняя нагрузка.

Такі падыход найбольш ярка прасочваецца ў адносінах раду кіруючых кадраў да самаадукацыі—формы, якая менш за ўсё паддаецца кантролю. Нягледзячы на тое, што ў гэтыя гады самастойнае вывучэнне тэорыі лічылася вышэйшай і асноўнай формай палітычнай адукацыі, частка камуністаў разглядала яе толькі як прыкрыццё сваёй бяздзейнасці ў гэтай галіне.

Не выпадкова ўсе пасляваенныя пленумы ЦК КП(б)Б, так або інакш разглядаўшыя праблемы партыйнай вучобы, вызначалі самаадукацыю як найбольш адстаючы яе ўчастак. А на XIX з'ездзе КП(б)Б (1949 год) першы сакратар ЦК КП(б)Б М. І. Гусараў адзначыў, што бескантрольнасць і слабасць арганізацыйнага пачатку ў справе самастойнага вывучэння тэорыі прывялі да таго, што частка работнікаў палітычна не расла [4]. Відавочна, што кіраўнікі, якія не жадалі павышаць уласны ідэйна-палітычны ўзро-

вень, мала клапаціліся і аб арганізацыі масавых форм партыйнай вучобы.

А між тым вядзенне агітацыйна-прапагандысцкай работы сярод насельніцтва лягло ў асноўным на плечы радавых камуністаў, прычым пераход ад форм і метадаў работы ваеннага часу да новых патрабаваў больш глыбокіх ведаў тэорыі, падзей унутранага і міжнароднага жыцця. Адукацыйны ж ўзровень рэспубліканскай партыйнай арганізацыі быў у цэлым невысокі: у 1945 годзе 58,5 % камуністаў мелі пачатковую або няпоўную сярэднюю адукацыю [5]. Таму на парадак дня паўстала пытанне аб неабходнасці паўсюднага аднаўлення сеткі палітшкол і гурткоў.

Першыя з іх з'явіліся практычна адразу пасля вызвалення абласцей Беларусі на буйных прамысловых прадпрыемствах. Паступова складвалася і сетка палітшкол пры сельскіх партарганізацыях. У 1944—1945 гадах іх дзейнічала ўжо 310 з колькасцю слухачоў 7790 чалавек, а к 1946 году у гуртках і палітшколах рэспублікі займалася больш 20 тыс. камуністаў [6].

Пры арганізацыі работы гэтых форм партыйнай асветы партыйныя камітэты рэспублікі сутыкаліся з найбольшымі цяжкасцямі: адсутнасць літаратуры, спецыяльных памяшканняў, падрыхтаваных прапагандыстаў і да т. п. Востры недахоп падрыхтаваных прапагандыстаў вымушаў штатных работнікаў аддзелаў прапаганды райкомаў і гаркомаў КП(б)Б браць на сябе кіраўніцтва некалькімі палітшколамі. Аднак дрэнныя веды людзей і абстаноўкі на месцах зніжалі ўзровень заняткаў у гэтых школах. Акрамя таго, існуючая практыка перашкаджала штатным прапагандыстам займацца арганізацыяй работы сістэмы партыйнай асветы ў цэлым.

Лепшыя вынікі былі ў тых партарганізацыях, дзе заняткі ў гуртках і палітшколах вялі прапагандысты з ліку мясцовых кіраўнікоў і інтэлігенцыі. На Мінскім аўтазборачным заводзе, напрыклад, некаторыя спецыялісты прадпрыемства ўзялі на сябе кіраўніцтва гурткамі па вывучэнню гісторыі ВКП(б) і пытанняў бягучай палітыкі. Добрыя веды людзей і абстаноўкі на заводзе давалі магчымасць прапагандыстам спалучаць вывучаемы матэрыял з задачамі, якія стаяць перад працоўным калектывам. Заняткі дапамагалі многім рабочым расшырыць свой кругагляд, уключацца ў грамадскае жыццё. Так, слухачы гуртка, якім кіраваў Ісленцьеў, рабочыя Гурскі і Абразевіч у час падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных 1946 года нядрэнна справіліся з работай агітатараў у інтэрнатах [7].

Такім чынам, працэс адраджэння партыйнай асветы ў БССР праходзіў у складаных умовах пасляваеннага разбурэння, недахопу ідэалагічных работнікаў, слабай матэрыяльнай і вучэбнай базы. Нягледзячы на гэта Камуністычная партыя Беларусі ў цэлым паспяхова вырашыла кадравую праблему і адрадзіла многія звенні партыйнай асветы, што існавалі ў рэспубліцы да вайны, стварыўшы аснову для далейшага развіцця сістэмы партыйнай вучобы.

Значныя змены, якія адбыліся ў падыходзе да партыйнай асветы летам 1946 года, былі звязаны з агульнай ідэалагічнай кампаніяй канца 40-х гадоў. Яна ўключала ў сябе не толькі ўзмацненне партыйнай прапаганды і агітацыі, але і стварэнне абстаноўкі нездаровай барацьбы і шальмавання кадраў дзеячаў навукі, літаратуры і мастацтва. Мэта кампаніі заключалася ва ўзмацненні камандна-адміністрацыйных метадаў у функцыяніраванні ўсіх звенняў дзяржаўнай структуры, уключаючы і ідэалагічную дзейнасць, заснаваных на дагматызме, які вёў да скажэння марксісцка-ленінскай тэорыі. Партыйная вучоба была важнай састаўной часткай гэтай дзейнасці і таму не выпадкова пастанова аб яе рэарганізацыі стаіць першай у серыі пастаноў па ідэалагічных пытаннях, прынятых ЦК ВКП(б) у 1946—1948 гадах.

Рашэнне ЦК ВКП(б) ад 20 чэрвеня 1946 года «Аб росце партыі і аб мерах па ўзмацненню партыйна-арганізацыйнай і партыйна-палітычнай работы з новымі членамі ВКП(б)»[8] паставіла задачу ахапіць партыйнай асветай усіх без выключэння камуністаў. У сувязі з тым, што большасць неахопленых вучобай складалі радавыя камуністы, галоўным напрамкам работы было стварэнне вялікай колькасці новых палітшкол і гурткоў. Колькасць апошніх, напрыклад, вырасла з 835 у 1946/47 навучальным годзе да 4175 у 1949/50[9], аднак большасць іх была створана паспешна, без уліку ўзроўню падрыхтоўкі слухачоў і наяўнасці падрыхтаваных прапагандыстаў. Грубае парушэнне прынцыпу добраахвотнасці ў партыйнай вучобе рэзка зніжала цікавасць камуністаў да заняткаў, а дагматызм у змесце і схаластычныя метады навучання рабілі партасвету малаэфектыўнай і фармальнай.

Такім чынам, спроба вырашыць у 1946—1948 гадах праблему аднасовага фарсіраванага росту розных форм партыйнай асветы і забеспячэння высокага ідэйна-палітычнага і тэарэтычнага ўзроўню навучання не ўдалася. Аднак ЦК КП(б)Б не спыняў намаганняў па павышэнню эфектыўнасці партыйнай вучобы. Дастаткова цвярозы аналіз зробленага і набыты за гэтыя гады пэўны вопыт даў магчымасць у 1949 годзе выдзеліць галоўнае звяно ва ўсёй рабоце. Гэтым звяном бачыўся падбор, падрыхтоўка і перападрыхтоўка прапагандыстаў, што знайшло адлюстраванне ў радзе пастаноў. Акрамя таго, курс на павышэнне якасці партыйнай вучобы дапаўняўся радам арганізацыйных мер. Пачынаючы з восені 1949 года ў сетцы партыйнай асветы былі ўведзены адзіныя тэрміны пачатку і заканчэння навучальнага года, адзіныя праграмы і вучэбныя планы. Пачала выдавацца вялікая колькасць вучэбнай і метадычнай літаратуры.

Заслугоўвае ўвагі пераход да партыйнай асветы, які намеціўся ў гэты перыяд, як да цэласнай і ўзаемазвязанай сістэмы. Камуністы пачыналі вывучэнне тэорыі ў палітшколах, або ў гуртках асноўнага тыпу, затым па меры набыцця ведаў і навыкаў самастойнай работы з кнігай пераходзілі ў больш высокія звенні партыйнай асветы. Тыя ў сваю чаргу рыхтавалі прапагандысцкія кадры для ніжэйшага звяна. Акрамя таго, слухачы сістэмы партыйнай асветы пастаянна папаўнялі рады агітатараў, палітінфарматараў, лектараў і дакладчыкаў. Усяго ў пачатку 50-х гадоў у розных звеннях партыйнай вучобы займалася 123,7 тыс. камуністаў. З іх 60 515 працавалі агітатарамі, 12 тыс.—дакладчыкамі [10].

Выступаючы ў комплексе з іншымі магутнымі сродкамі ідэалагічнага ўздзеяння—друкам, радыё, агітацыйна-масавай, культурна-асветнай работай, літаратурай і мастацтвам, партыйная вучоба аказвала немалы ўплыў на фарміраванне светапогляду камуністаў і ўсіх працоўных калектываў рэспублікі. Аднак неабходнасць наблізіць змест навучання да рэальнасцей унутранага і міжнароднага жыцця, гэта значыць зрабіць вывучэнне тэорыі максімальна эфектыўным з пункту гледжання пасляваеннага аднаўлення краіны, пастаянна ўступала ў супярэчнасць з дагматызмам і скажэннямі ў змесце матэрыялу, з абыякавасцю слухачоў і прыпіскамі ў справаздачах. Няспынныя заклікі да павышэння ідэйнага ўзроўню навучання, увязкі тэорыі з задачамі мясцовых партыйных арганізацый не знаходзілі водгуку.

Нягледзячы на немагчымасць поўнага вырашэння гэтай супярэчнасці ва ўмовах культу асобы, усё ж ідэалагічнай рабоце ў гэты перыяд нельга адмовіць у эфектыўнасці. Мільёны савецкіх людзей ва ўмовах гаспадарчай разрухі, голаду 1946 года, напружанай унутранай і міжнароднай абстаноўкі змаглі ў кароткі тэрмін адрадзіць рэспубліку. Аднак гэту эфектыўнасць не варта перабольшваць. Партыйная прапаганда ў перыяд культу асобы была неад'емнай часткай усёй каманднa-адміністрацыйнай сістэмы і рэзультатыўна працавала толькі ў комплексе з усімі яе складаючымі: жорсткім цэнтралізмам, рэпрэсіямі, «жалезнай заслонай», недапушчэннем іншадумства і да т. п. Таму механічнае перанясенне метадаў партыйнай асветы 40-х гадоў у сучасныя ўмовы можа прынесці толькі шкоду, як гэта адбылося, напрыклад, у 70-я гады, калі ігнараванне аб'ектыўнай рэальнасці ў прапагандзе было ўзведзена ў абсалют.

З другога боку, несумненна, заслугоўвае ўвагі канцэпцыя сістэмнасці і пераемнасці ў партыйнай асвеце, арыентацыя яе пераважна на камуністаў, або беспартыйных, якія рыхтавалі сябе да ўступлення ў партыю, а галоўнае—адносіны да партыйнай вучобы як да важнейшага сродку ідэйна-палітычнага выхавання, і тыя значныя намаганні для яе адраджэння і развіцця.

Удасканаленне сістэмы партыйнай вучобы, як і ўсёй ідэалагічнай работы, патрабуе няспыннага пошуку эфектыўных форм і метадаў работы. Яна павінна ажыццяўляцца на аснове набытага вопыту, удакладнення раней прынятых рашэнняў, уліку спецыфікі дадзенага гістарычнага моманту, спецыфікі асобных сфер і галін народнай гаспадаркі.

[1] Гл.: КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М., 1985. Т. 7. С. 506.
[2] Гл.: Вестн. Белорусского ун-та. Сер. 3. 1974. № 2. С. 21.
[3] ПА ИИП при ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 47, спр. 105, л. 9, 10, 39.
[4] Гл.: Гусаров Н. Отчетный доклад Центрального Комитета Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии на XIX съезде КП(б)Б. Минск, 1949. С. 106.
[5] Гл.: КПБ в цифрах. Минск, 1978. С. 87.
[6] ПА ИИП при ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 47, спр. 85, л. 271; спр. 105, л. 138.

[7] Гл.: Звязда. 1946. 30 сакавіка.
[8] КПСС в резолюциях... Т. 8. С. 24.
[9] ПА ИИП при ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 47, спр. 73, л. 24; спр. 214, л. 368.
[10] Гл.: Патоличев Н. С. Отчетный доклад Центрального Комитета Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии на XX съезде КП(б)Б. Минск, 1952. С. 47, 49—50.

С. А. ЮРЫС

## АДНАЎЛЕННЕ КААПЕРАТЫЎНАГА ГАНДЛЮ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1945—1947)

Вайна і часовая акупацыя тэрыторыі Беларускай ССР нанеслі гаспадарцы спажывецкай кааперацыі вялізны ўрон. Ён склаў 807 млн рублёў. Было знішчана і пашкоджана 6448 кааператыўных пабудоў, сярод якіх: 2548 магазінаў, 1827 складоў і 179 жылых будынкаў [1]. Ужо ў красавіку 1942 года ў Маскве пры Цэнтрасаюзе пачала працаваць аператыўная група Белкаапсаюза, якая займалася ў асноўным кадравымі пытаннямі. Былі ўзяты на ўлік работнікі сістэмы Белкаапсаюза, эвакуіраваныя ва ўсходнія раёны краіны, прыняты меры па падрыхтоўцы новых кадраў. Так, у 1942—1943 гадах 63 бухгалтары прайшлі навучанне на чатырохмесячных курсах пры Новасібірскім і Чкалаўскім аблспажыўсаюзах, а з дапамогай Тамбоўскага аблспажыўсаюза было падрыхтавана 16 кіраўнікоў гандлю райспажыўсаюзаў [2].

Па меры таго, як вызвалялася ад варожых войск тэрыторыя рэспублікі, пачыналася аднаўленне кааператыўнай гаспадаркі. Ужо ў першым квартале 1944 года была адноўлена сетка спажывецкай кааперацыі ў 48 раёнах Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Палескай абласцей [3].

На пасяджэнні прэзідыума праўлення Белкаапсаюза 31 жніўня 1945 года, а потым на нарадзе старшынь аблспажыўсаюзаў (20 лістапада) былі падведзены вынікі дзейнасці па аднаўленню спажыўкааперацыі і вызначаны яе канкрэтныя задачы ва ўмовах мірнага жыцця. Задавальняць попыт сельскага насельніцтва работнікі спажывецкай кааперацыі былі павінны шляхам усялякага пашырэння тавараабароту за кошт мясцовых вырабаў. У кароткія тэрміны трэба было перайсці на даваенныя ўмовы забеспячэння пастаўшчыкоў таварамі, разгарнуць сетку раймагаў, культмагаў, сельмагаў і падрыхтавацца да значнага пашырэння ў 1946 годзе колькасці спецыялізаваных і агульных магазінаў, разгарнуць гандаль таварамі гаспадарчага прызначэння, паляпшаць бытавое абслугоўванне, павялічваць нарыхтоўкі сыравіны [4]. Абласныя камітэты партыі патрабавалі ад РК КП(б)Б прыняць канкрэтныя меры па ўзмацненню кіраўніцтва гандлёвымі арганізацыямі, накіроўваючы іх на хутчэйшае адраджэнне гандлевай сеткі, на бесперабойнае забеспячэнне насельніцтва таварамі першай неабходнасці.

У чацвёртай пяцігодцы аб'ём рознічнага тавараабароту дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю Беларусі павінен быў павялічыцца на 28 % у параўнанні з 1940 годам. Для ажыццяўлення пераходу ад нарміраванага забеспячэння насельніцтва па картачкам да разгорнутага гандлю прадугледжвалася пашырыць гандлёвую сетку, забяспечыць гандлёвыя арганізацыі кваліфікаванымі кадрамі, транспартам, абсталяваннем, інвентаром [5]. У сістэме спажывецкай кааперацыі была распрацавана праграма развіцця сеткі прадпрыемстваў рознічнага гандлю і грамадскага харчавання, баз і складоў.

Ужо першы год рэалізацыі заданняў плана аднаўлення і развіцця кааператыўнага гандлю БССР паказаў павелічэнне яе ролі ў барацьбе за павышэнне матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню савецкага народа. Аднак перабудова сельскага гандлю ў дачыненні да запатрабаванняў мірнага часу ажыццяўлялася марудна, у гандлёвай дзейнасці спажывецкай кааперацыі выяўляліся істотныя недахопы. Кепска ўключаліся ў тавараабарот вырабы мясцовай вытворчасці. Так, удзельная вага дэцэнтралізаваных закупак у рознічным тавараабароце Беларусі 1946 года складала толькі 9,6 %[6].

Новы этап развіцця савецкага кааператыўнага гандлю адкрыла пастанова Савета Міністраў СССР ад 9 лістапада 1946 года «Аб разгортванні кааператыўнага гандлю ў гарадах і пасёлках харчовымі і прамысловымі таварамі і аб павелічэнні вытворчасці харчавання і тавараў шырокага ўжытку кааператыўнымі прадпрыемствамі». Дзейнасць спажывецкай каа-